


Покліч Волі плюс

красавік
№3(13)
2005

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА ВІЦЕБСКАГА РАЁНА

● ***Верш нумару***

*Не зьгінай мяне, я не
сагнуся,
Не баюся ні страхаў, ні
зла.
Нездарма я з зямлі
беларускай
Непахіснай сасною
ўзрасла.*

*Напрасткі йду
няходжанай сьцежкаю,
Мудрасьць продкаў у
гарачай крыві,
Ні прад кім не схіляю
пасьпешна
Крыху гордай сваёй
галавы.*

*Абмінаю ўсю набрыдзь,
што вокал
Чалавечы мой блытае
лёс.
Гляджу ўдаль, не
маргнуўшы нат вокам.
Розум цемру праніжа
наскрозь!*

Ларыса Генiюш.



"РОЗУМ ЦЕМРУ ПРАНІЖА НАСКРОЗЬ!"

У красавіку памёр першы славянскі Папа Рымскі— Ян Павал 2. Увесь сьвет сумаваў разам з каталікамі. Асоба Караля Вайтылы стала агульнапрызнаным аўтарытэтам не толькі для каталікоў, але і для вернікаў іншых канфесій, і для ўсіх добрых людзей, што знешне аніяк не выяўляюць сваіх рэлігійных пачуццяў.

На паховіны зьехаліся і юдэі, і масульмане, і пратэстанты, і буддзісты... Не абмінулі жалобнае цырымоніі і прэзідэнты, і каралеўскія асобы. Буш, які каталіком не з'яўляецца, прыехаў таксама. А вось Пуцін з Лукашэнкам часу не знайшлі. Як не знайшлі яго ні Алексій, ні Філарэт. Сутнасная чужароднасьць гэтых асобаў свабоднаму сьветабачаньню выявілася нават у такую жалобную хвіліну, перад якой усе роўныя. Нядольнасьць да яднаньня і кампрамісу—праява няўпэўненасьці і слабасьці— прагучала і ў інтэр'ю мітрапаліта Смаленскага і Калінінградскага, які дакараў Яна Паўла 2 у ягонай прастаце і ў няздольнасьці да дыпламатыі., ды выражаў надзею да ўзаемапаразуменьня паміж цэрквамі звязаную з абраньнем новага Папы.

"Мужнасьці і адвагі" жадаў Папа беларускаму народу на шляху да свабоды. Толькі ці пачуюць беларусы ягоныя словы, ці зразумеюць іхні глыбінны сэнс? Лукашэнка, напрыклад, зразумеў іх, як падтрымку ягонай быццам бы сацыяльна арыентаванай палітыкі. Хай гэткае разуменне будзе на ягоным сумленьні.

А вось мітрапаліт Філарэт 26 красавіка выступіў па тэлевізіі з асуджэньнем маладзёнаў, што выйшлі на акцыю пратэсту ў Мінску. Гэта было першае асуджэньне натуральнай прагі моладзі да свабоды главой праваслаўнай царквы і гэта факт трывожны—праваслаўная царква становіцца апорай аўтарытарнага рэжыму. Замест таго, каб служыць Богу, яна служыць уладзе.

З імем памерлага Папы звязаны працэсы распаду таталітарных сацыялістычных рэжымаў Еўропы і Савецкага Саюзу, умацаваньне аўтарытэту каталіцкай царквы ў сьвеце. Вось гэтага на падсьвядомым узроўні і не могуць дараваць яму вышэйзгаданыя асобы нават пасьля сьмерці.

Толькі нягледзячы ні на што неяк верыцца ў тое, што ўлада хлусьні не будзе панаваць на Беларусі доўга. І неяк верыцца ў тое, што промні свабоды і розуму праніжуць цемру страху, што апанавала душамі беларусаў.

Рэдактар.

Навіны жыцця

РЫБАЛКА, НАВАТ І СПАРТОВАЯ– ГЭТА НЕ ХОБІ, ГЭТА ДЫЯГНАЗ

Напярэдадні веснавой забароны лову рыбы (ад 1 красавіка) раённая арганізацыя Беларускай грамады паляўнічых і рыбаловаў правяла на возеры Лосьвіда раённыя спаборніцтвы па спартоваму лову зімняй вудай на мармышку.

З 20 удзельнікаў зарэгістраваных напачатку да фінішу дайшлі толькі 12. Астатнія настолькі заняліся сваёй справай, што забылі пра час, вызначаны ўмовамі спаборніцтва.

Першае мейсца, злавіўшы 1 кілаграм 100грамаў, заняў асьпірант ветакадэміі М.Воўкаў. Спальны мяшок і вуда для зімовага лову з лёскай сталі ўзнагародай для пераможцы.

Другое мейсца заняў спадар А.Яфімаў, які злавіў рыбы ўсяго на 20 грамаў меней. Трэцяе мейсца за сп. С.Барысевічам. Узнагародамі для абодвух сталі вуды для летняга і зімовага лову.

Самую вялікую рыбіну выцягнула адзіная на спаборніцтве жанчына В.Драздова. 70- грамовая плотка пацягнула на заахвочвальны прыз— вуда для зімовага лову з лёскай. Апроч плотак лавіліся яшчэ акунькі і гусьцяра.

На завершаньне нягледзячы на дасягненьні ўсіх накармілі юшкай.

ТЫ МЯНЕ ПАРАДЗІЎ, А Я ЦЯБЕ...

Выпадкі гвалтоўных дзеянняў у адносінах да састарэлых бацькоў з боку пасталелых дзетак даўно перасталі быць рэдкасьцю. Так у вёсцы Пухавічы тройчы судзімы 27-гадовы Ю.П. на працягу доўгага часу ў п'яным стане здзекваўся над сваім бацькам.

Стары доўга насіў на сваім целе сінякі, рубцы і шнары. Дайшло да таго, што згубіў старэча і некалькі сваіх зубоў. Але некалі ўсяму надыходзіць канец—суд асудзіў сынкасадыста да 6 месяцаў арышту.

РАБУЮЦЬ ФАЗЭНДЫ

Лецішчы па ранейшаму застаюцца аб'ектам зацікаўленьня для рабаўнікоў. За адсутнасьцю ўладароў у в. Шалыгі праз выстаўленыя шыбы рабаўнікі вынесьлі адзеньне, бялізну, посуд, тэлефон на суму 344 тыс. руб.

У в.Шабуні падобны крадзёж адбыўся на суму 328 тыс.руб. Злачынцы вынесьлі алюмініві бідон, 60 метраў меднага кабелю, адзеньне.

У гэтай жа вёсцы ў пенсіянера скралі прадукты.

ХУЛІГАНСТВА

За 2004 год у Віцебскім раёне зарэстравана 35 фактаў хуліганстваў, па 30 з іх падазроныя высьветлены. У 2005 годзе іх ужо 14, 12 хуліганстваў вядомыя.

Прычынамі гэтага злачынства ёсьць п'янства і хібы чалавечае натуры.

У в.Падбярэзьзе выпадак хуліганства адбыўся пры сьведках. Дзяцюк Іван, добра падзарадзіўшыся, невядома з якой нагоды пачаў чапляцца да жыхаркі гэтай жа вёсцы Тацяны. Калі жанчына мужна адмовілася падпарадкоўвацца злачынцу, той спачатку ўдарыў яе рукамі, а калі тая звалілася долу, пачаў зьбіваць яе нагамі.

На шчасьце аднавяскоўцы, што вярталіся са сходу, ураталі пацярпелую. Дома дачка выклікала хуткую дапамогу. Медыкі засьведчылі факт зьбіцьця. Справа дайшла да суда. Вырак—240 гадзінаў папраўчай грамадскай працы.

І ШАВЕЦ, І СПАРТОВЫ ГУЛЕЦ...

Круглагадовая спартакіяда працаўнікоў адукацыі фінішуе праз 2 месяцы.

На вясновых канікулах у Ноўкінскім спартовым комплексе адбыліся спаборніцтвы па баскетболе і валейболе.

Першае месца па валейболе з 17 камандаў занялі працаўнікі Сасноўскай СШ-саду. Другое месца за камандай Воранаўскай СШ, трэцяе за камандай Бабінічскай СШ.

У спаборніцтвах па баскетболе па-за канкурэнцыяй былі працаўнікі Акцябрскай СШ. Далей разьмясьцілася Курынская школа, за ёй Запольская.

Каму патрэбныя гэтыя псеўдаспартовыя мерапрыемствы вядома яшчэ з савецкіх часоў. Вось толькі ці патрэбныя яны самім настаўнікам?

ГАЗАВІКІ ВУЧАЦЬ ПРАЦАВАЦЬ СЯЛЯНАЎ

СПК " Мазалава" далучылі да РУП "Віцебскоблгаз". Вытворчы ўчастак ўзначаліў Сяргей Хаміненка.

2 млрд.рублёў уклалі газавікі ў новую тэхніку:2 "Кіраўцы", 5 "Беларусаў", 3 прычэпы, 5 плугоў рознай мадэфікацыі, культыватар, сеялку, камбайн " Палесьсе"і іншае начэпнае абсталяваньне.

На працу прынята некалькі дзесяткаў чалавек, ідзе падбор новых кадраў. У будынку былой канторы абсталяваны інтэрнат для халасьцякоў. Пабудаваны 3 катэджы для сьпецыялістаў. Ідзе рэканструкцыя закінутага будынку пад клуб і спартовую залу.

Новыя гаспадары ставяць перад сабою задачу надаіць ад каровы да 3000 кг. малака, сабраць да 40 цэнтнераў з гектару. Ужо зараз прывесы вырасьлі ў 3 разы, надоі павялічыліся ў 2,5 разы.

Новых сьпецыялістаў накіроўваюць у іншыя гаспадаркі параймаць перадавы досьвед. Чым чорт не жартуе, мо і змусяць газавікі працаваць сялянаў?

ЧАС СПЫНІЎСЯ Ў МІНУЛЫМ

На чарговым паседжаньні Віцебскага райвыканкаму разгледжана пытаньне " Пра стан ідэалагічнай працы ў раёне і мерах па яе ўдасканаленьні"

Год назад была ўтворана ў раёне ідэалагічная служба. Важную ролю надае кіраўнік ідэалагічнага адзелу раёна А. Красакоў адзіным дням інфармаваньня насельніцтва і працоўных калектываў.

Аднак па ранейшаму не вырашана праблема кадраў, у прыватнасьці дасёньня няма ідэолагаў у ЗАО " Адраджэньне", РУСХП " Эксперыментальная база ім. Шмырова"...

Не на ўсіх прадпрыемствах узноўлены Дошкі пашаны і іншыя формы нагляднай агітацыі.

Найбольш прадвінутыя і абазнаныя ў сваёй дзейнасьці адмыслоўцы падзяліліся сваім досьведам.

Ад падобнай інфармацыі патыхае такой сьмярдзючай даўнінай, што падаецца, нібы час спыніўся ў мінулым, а тыя, хто сур'ёзна гавораць пра ідэалогію ў або ачмурэлі, або абкурыліся.

Падрыхтаваў С. Горкі.

КОЛАДЗЁН

Чарговы веснавы месяц краіны атрымаўся з вялікімі перападамі тэмператур. Спачатку хутка настала пацяпленне, а потым пасля адключэння ацяплення пачаліся начныя маразы. Але для правінцыі яны ўжо азначалі астылыя кватэры, якія улады моцнай і квітнеючай Беларусі не жадаюць ацяпляць. І гэта рэальная мадэль нашага жыцця – без фанфараў дзяржаўных СМІ.

Рэальнай падзеяй, якая выклікала яднанне хрысціянскага свету стала смерць выдатнага дзеяча каталіцызму XX стагоддзя Яна Паула II. Беларусы здолелі убачыць, што значыць духоўны лідэр каталікаў і як яны па яму смуткавалі! Без прымусовай апрацоўкі, па жаданню свайго сэрца! Ці можа чакаць такі лёс першага беларускага прэзідэнта? Недарэчнае пытанне.

У грамадскім жа жыцці краіны пэўнай падзеяй стала правядзенне абласных канферэнцый па абранню адзінага кандыдата на выбарах 2006 года. У гэтым працэсе, як у люстэрку адбіліся ўсе праблемы барацьбы апазіцыі. Па-першае, адсутнасць харызматычнага лідэра; па-другое, адарванасць ад жыцця правінцыі, а па-трэццяе, слабая адданасць дэмакратычнай працэдуры. Вынікі гомельскай канферэнцыі выклікалі моцнае незадавальненне у АГП. Не такія разлічвалі атрымаць вынікі. Але ж лідэр гомельскіх лібералаў, лідэр грамадзянскай супольнасці вобласці Віктар Карніенка узначальвае штаб Мілінкевіча і працуе з ім у адной камандзе не адзін год. Больш сціпла трэба сябе паводзіць, спадары лібералы.

У красавіку сацыял-дэмакраты здолелі правесці аб'яднаўчы з'езд. Зноў са скандалам, калі зарэгістраваная партыя БСДП (НГ) праплаціўшы тры памяшканні ні ў водным не здолела правесці з'езд, а правяла на прыступках Сеніцкага ДК за кальцавой сталічнай дарогай. Вось і адсутнасць дыктатуры з тыраніяй!

Красавік, як звычайна, стаў месяцам інтэграцыйных сустрэч кіраўнікоў Расіі і Беларусі. І па завядзенцы афіцыйныя СМІ паднялі прапагандыскую хвалю аб поспехаў у будаўніцтве саюзнай дзяржавы, але ўсе гэтыя поспехі — папяровыя.

Між тым дзяржаўная бюракратычная машына знішчае адну выспу вольнадумства за другой. Канстытуцыйны пераварот 1996 года даў уладам неабмежаваныя магчымасці рабіць антычалавечыя захады па абмежаванню правоў чалавека. Усе гэта робіцца пад выглядам квазізаконнасці, як і ў выпадку з РГА "НІСЭПД", што займаўся сацыялагічнымі даследаваннямі і прдстаўляў грамадскасці непажаданыя для ўладаў вынікі апытання грамадскай думкі. Так атрымалася і з сакавіцкім апытаннем. А ў красавіку вядучы сацыялагічны Цэнтр Беларусі зачынілі. Апошнія сацыялагічныя вынікі, яшчэ дзеючага НІСЭПД прадстаўляем вашай увазе.

Пра гэтыя і іншыя навіны чытайце ў нашым красавіцкім аглядзе.

Леанід Гаравы.

Ян Павал Другі, яго жыцьцё і спадчына

Аляксей Дзікавіцкі, Варшава. *Ян Павал Другі – Караль Юзэф Вайтыла – нарадзіўся 18 траўня 1920 году ў мястэчку Вадавіцэ каля Кракава. Сям'я Вайтылы, а ў яго быў яшчэ старэйшы брат Эдмунд, жыла даволі сьціпла – з заробку бацькі-чыноўніка. Каталіцкую царкву кардынал Вайтыла ўзначаліў у 1978 і стаў першым Папам цягам 455 гадоў, які не паходзіць з Італіі. Пра жыцьцё Папы, ягонае значэньне для Польшчы і ўсяго сьвету расказвае наш варшаўскі карэспандэнт.*

Караль Вайтыла быў вельмі здольным хлопцам – ён добра вучыўся, рэгулярна граў у футбол і езьдзіў на лыжах, а таксама браў актыўны ўдзел у працы школьнага тэатру. Яшчэ ў дзяцінстве будучы Папа перажыў сьмерць самых блізкіх людзей – памерла ягоная маці і брат, а ў 1941 годзе памер і ягоны бацька.

У гэтым жа годзе Караль Вайтыла, які ўжо быў тады студэнтам факультэта польскай філялёгіі Ягелонскага унівэрсытэту, што ў Кракаве, кінуў вучобу і пайшоў працаваць на фабрыку. Вайтыла быў сябрам падпольнай арганізацыі "Унія", якая, сярод іншага, хавала габрэяў ад фашыстаў, а таксама, разам зь сябрамі, сур'- ёзна займаўся тэатральнымі пастаноўкамі.

Аднак у 1943 будучы Папа нечакана кінуў тэатар і вырашыў вывучаць тэалёгію ў некалькіх падпольных навучальных установах. Пасьля сканчэньня вайны Вайтыла працягнуў вучобу ў Рыме і стаў сьвятаром.

У 1963 годзе Караль Вайтыла быў прызначаны архібіскупам Кракаўскім, а праз 4 гады атрымаў тытул кардынала.

16 кастрычніка 1978 году ў 18:44 вернікі, якія сабра-ліся на пляцы сьвятога Пятра, пачулі афіцыйнае паведамленьне: "Папа абраны – ім стаў кардынал Караль Вайтыла".

Абраньне Папам грамадзяніна сацыялістычнай краіны мела значны ўплыў на далейшыя падзеі ва Ўсходняй Эўропе і Азіі. Вось што сказаў нашаму радыё былы прэзыдэнт Польшчы Лех Валэнса:

(Валэнса:) "Гэта быў вель-мі цяжкі працэс. Пасьля столькіх паразаў людзі ўжо ня верылі ў канец камунізму. Я цягам 20 гадоў зьбіраў вакол сябе людзей, гатовых да змаганьня, і ведаеце колькі назьбіраў – 10 чалавек былі гатовыя змагацца! Астатнія ня верылі, былі зламаныя, з галавой, задуранай камуністычнай прапагандай. І тут адбылося нешта непраўдападобнае – у 1978 годзе паляк стаў Папам!

Праз год Папа прыехаў у Польшчу – мільёны людзей прыходзілі на сустрэчы зь ім. Тады ва ўсім сьвеце пачалі думаць – што ж гэта робіцца ў гэтай камуністычнай краіне? Гэта дапамагло абудзіць народ – польскі народ абудзіўся, а разам зь ім і іншыя. Народ перастаў баяцца. Бо Сьвяты айцец, сярод іншага, гаварыў: ня бойцеся – зьмяняйце аблічча гэтай зямлі. Праз год пасьля пілігрымкі Папы я змог арганізаваць ужо 10 мільёнаў чалавек, якія былі гатовыя да змаганьня. Без абуджэньня народу Сьвятым Айцом гэтага б не атрымалася".

Вось што сказаў Папа ў Польшчы ў часе першай пілігрымкі:

(Папа:) "З глыбіні гэтага тысячагодзьдзя заклікаю разам з Вамі: няхай Дух Сьвяты сыдзе і адновіць аблічча зямлі.... гэтай зямлі".

(Валэнса:) "Менавіта тыя два дададзеныя Папам на Плошчы перамогі ў Варшаве словы – "гэтай зямлі", ды словы аб тым, што "ня можа быць справядлівай Эўропы без незалежнай Польшчы" і сталі для палякаў сыгналам да пераменаў".

13 траўня 1981 году ў часе аўдыенцыі на пляцы сьвятога Пятра на Яна Паўла другога быў зьдзейсьнены замах – ён быў паранены. Дагэтуль невядома, хто стаяў за гэтым замахам. Паводле адной з вэрсіяў, гэта быў савецкі КГБ.

Вялікі ўнёсак Папа зрабіў і ў справу прымірэньня паміж рэлігіямі, а таксама ў тое, каб наблізіць царкву і ўласна асобу пантыфіка да вернікаў. Для мільёнаў людзей Ян Павал Другі стаў найвялікшым маральным аўтарытэтам у сьвеце.

Ян Павал Другі заўсёды любіў сваё роднае мястэчка Вадавіцэ і Кракаў. Некаторыя землякі Папы памятаюць Караля Вайтылу яшчэ маленькім хлопчыкам, які з зайздрасьцю глядзеў з вуліцы праз шыбы на ўладальніка кандытарскай: вось дзе пашчасьціла, ён жа можа гэта ўсё пакаштаваць!

(Жыхарка Вадавіцэ:) "Мне так яго шкада. Не было такога Папы ніколі і ня будзе".

БЕЛАРУСЬ, РОССИЯ И США СЫГРАЮТ В ИГРУ БЕЗ ПРОИГРАВШИХ?

Критические высказывания первых лиц Соединенных Штатов о недемократическом характере политического строя Беларуси в ближайшее время могут утратить декларативные интонации. Складывается впечатление, что в геополитических планах США наша страна перемещается на верхние позиции.



По информации американских СМИ, в ходе своего визита в Ригу 7-8 мая президент США Джордж Буш планирует встретиться с лидерами белорусской оппозиции, а уже 21 апреля встречу с представителями демократических сил Беларуси в Вильнюсе проведет госсекретарь Соединенных Штатов Кондолиза Райс.

Как считает официальный представитель МИД России Александр Яковенко, «Кондолиза Райс является одним из авторитетных и влиятельных представителей администрации Джорджа Буша. И от ее вклада в немалой степени будет зависеть, как станут развиваться российско-американские отношения в предстоящий период».

От Кондолизы Райс многое будет зависеть и в белорусско-американских отношениях. В частности, характер позиции, которую Соединенные Штаты будут занимать по отношению к нашей стране. Пока признаков возможного потепления контактов не заметно. Так, по дороге в Москву Кондолиза Райс вновь выступила с критическими заявлениями о положении Беларуси и политике ее властей.

«Беларусь отброшена назад из-за природы нынешнего режима, и ее невозможно куда-либо интегрировать. Народ Беларуси заслуживает лучшей доли», — сказала она в беседе с журналистами на борту своего самолета. И добавила, что «Россия больше, чем кто-либо еще, выиграла бы от реформированной, демократической и процветающей Беларуси, благодаря потенциалу для торговых и экономических взаимоотношений, не говоря уже о родственных связях между народами».

Позиция Соединенных Штатов, в принципе, ясна: Россия при определенных обстоятельствах может поддержать экспорт демократии в Беларусь. Есть у США и рычаг давления на Кремль. В следующем году Россия впервые должна провести у себя саммит «большой восьмерки». Но, как пишет «The Washington Post», «американские конгрессмены предложили к рассмотрению законопроект, приостанавливающий членство России в «большой восьмерке» по той причине, что в России, как они говорят, больше нет демократии. Райс не согласилась с этим предложением, она говорит о том, что важно, чтобы Россия не оказалась в изоляции, но при этом Россия должна обратить внимание на проблемы, вызывающие беспокойство Запада».

«Москва должна предпринять все усилия для того, чтобы убедить мир, что она понимает ту ответственность, которую налагает членство в таких организациях, как «большая восьмерка», — сказал Кондолиза Райс. По ее словам, «большая восьмерка» создавалась как «группа демократических государств», которые придерживаются принципов «свободного рынка, свободной торговли, норм права».

«Сильного давления на Россию по белорусскому вопросу ожидать не стоит, — прогнозирует эксперт «Белорусских новостей». — Хотя заявления Кондолизы Райс довольно симптоматичны. И, в общем, она права, заявляя, что соседство с демократизированной Беларусью для России было бы более выгодным. Впрочем, решать это будет сама Россия».

Как считает лидер Объединенной гражданской партии Анатолий Лебедько, высказывания Кондолизы Райс свидетельствуют, что сегодня никто за спиной Беларуси не пытается решить ее судьбу. «Очевидно, что Беларусь не отдана в зону интересов какой-то конкретной страны или группы стран вопреки расхожему мнению, что Беларусь — это лишь фигура большой геополитической игры, которую можно двигать как пешку, — говорит политик. — И США открыто предлагают России обсудить этот вопрос, хотя реакцию Путина прогнозировать трудно: он не любит Лукашенко, но еще больше он не любит «оранжевые революции».

Сегодня в Москве касательно политики Вашингтона на постсоветском пространстве высказалась и Кондолиза Райс, заявившая, что у США нет намерения сократить влияние России в СНГ: «На самом деле мы видим это не как игру, в которой кто-то проигрывает, а кто-то выигрывает, а такую игру, в которой у всех есть возможность победить, когда создаются процветающие, экономически развитые страны на границах России».

Если даже предложенная Кондолизой Райс формула, по которой взаимные интересы США и России в отношении Беларуси смогут избежать конфликта, сработает, еще остаются интересы самой Беларуси, что в данном случае кажется вопросом первостепенным. Внутри нашей страны, как известно, единого мнения давно не наблюдается. Оппозиция безуспешно добивается демократических преобразований, а власть под лозунгом защиты суверенитета и сохранения внутренней стабильности все больше изолирует Беларусь от внешнего мира.

Александр ЗАЙЦЕВ.

Пуцін і заходнія лідэры маюць магчымасьць дамовіцца 9 траўня ў Маскве аб адхіленьні Лукашэнкі ад улады?

Сяргей Абламейка, Прага *Сёньня газэта "Moscow Times" апублікавала артыкул міжнароднага аглядальніка літоўскай газэты "Lietuvos Rytas" Рычарда Крыкаса, у якім выкладаецца плян мірнай зьмены ўлады ў Беларусі з дапамогай Расеі. Больш падрабязна з артыкулам вас пазнаёміць наш карэспандэнт.*

За апошнія 17 месяцаў, – піша Рычард Крыкас, – Уладзімер Пуцін зазнаў шэраг няўдачаў на фронце зьнешняй палітыкі. Гэта падзеі ў Грузіі, Украіне, Малдове і Кіргізстане. Як вынік, у Пуціна ўсё меней падставаў для таго, каб лічыць СНД жыцьцяздольнай структурай, якая можа дапамагчы Расеі дамінаваць на прасторы былога СССР.

Цяперашнюю пазыцыю Крамля Рычард Крыкас называе палітычнай блізарукасьцю. Як прыклад новага расейскага імпэрыялізму і чарговай зьнешнепалітычнай памылкі Масквы, аўтар прыводзіць абвінавачаньні Латвіі і Эстоніі ў нэафашызме. У выніку прэзыдэнт ЗША Джордж Буш па дарозе ў Маскву на сьвяткаваньне дня перамогі 9 траўня спыніцца ў Латвіі і правядзе сустрэчы з усімі трыма прыбалтыйскімі прэзыдэнтамі.

Паколькі ўнутраная і зьнешняя палітыка Пуціна у апошнія гады значна пашкодзіла яго імідж на Захадзе, дык на думку Рычарда Крыкаса, якраз сустракаючыся ў наступным месяцы ў Маскве з заходнімі лідэрамі, Пуцін мае шанец істотна палепшыць свой вобраз з дапамогай сьмелай ініцыятывы – а менавіта, дапамагчы ўрэгуляваць беларускае пытаньне.

На думку літоўскага журналіста, прыпушчэньне, што Пуцін пачне перамовы са сваімі заходнімі калегамі аб мірным адхіленьні Лукашэнкі ад улады, і для заходніх, і для расейскіх аналітыкаў выглядае наіўным. Гэтаму ёсьць дзьве прычыны. Па-першае, у адрозьненьне ад былых рэжымаў у Грузіі і Украіне, Лукашэнка значна мацней трымаецца пры ўладзе, падрыхтаваў дзеяздольныя ўзброеныя сілы для падаўленьня хваляваньняў, а беларуская апазыцыя слабая і абяскроўленая эміграцыяй, запалохваньнем, судамі і пасадкамі лідэраў у турму. Па-другое, Лукашэнка – самы блізкі саюзьнік Расеі, і з-за няўдачаў у іншых былых савецкіх рэспубліках, Пуцін можа пайсьці на аб'яднаньне зь Беларусяй. І гэта, паводле Рычарда Крыкаса, было б фатальнай памылкай і разыходзілася б з нацыянальнымі інтарэсамі Расеі.

Пуцін хоча аднавіць вядучую ролю сваёй краіны ў сьвеце, але дэмаграфічныя, эканамічныя, палітычныя і сацыяльныя праблемы Расеі могуць быць вырашаны толькі з дапамогай заходніх дэмакратычных дзяржаваў. Толькі Захад можа дапамагчы Расеі нармальна эксплюатаваць яе прыродныя багацьці ў Сыбіры.

Лукашэнка можа пратрывацца яшчэ нейкі час, – піша Рычард Крыкас, – але дні яго ўжо палічаныя. Калі ж Пуцін пойдзе на саюз зь Беларусьсю, ён ня знойдзе новых сяброў ні ў Беларусі, ні на Захадзе. Наадварот, такі крок здольны павялічыць антырасейскія настроі і ў Беларусі, і на Захадзе, і паўсюль на абшары былога СССР. Да таго ж, няма пэўнасьці, што менская эліта гарой стаіць за Лукашэнку, і што пры першым зручным выпадку яна і сілавыя структуры не пяройдуць на бок супернікаў Лукашэнкі. Няма сумневу, што многія зь беларускага палітычнага клясу шукаюць спосаб парваць з Лукашэнкам.

У такой сытуацыі, паводле артыкулу літоўскага аглядальніка у газэце "Moscow Times", Пуцін і заходнія лідэры маглі б даць ім такую магчымасьць, пагадзіўшыся на наступныя ўмовы. Папершае, Лукашэнка пакінуў бы сваю пасаду, атрымаўшы гарантыі, што яго ня будуць судзіць за мінулыя правіны. Беларускі лідэр мог бы зрабіць гэта, калі б Расея падтрымала заклікі захаду да яго пакінуць сваю пасаду. Перад саюзам Расеі і Захаду ў Лукашэнкі не засталося б аргумэнтаў. Па-другое, абмежаваньні на свабоду прэсы ў Беларусі былі б зьнятыя. Па-трэцяе, наглядальнікі Эўрапейскага Зьвязу маглі б распачаць працэс, які гарантаваў бы правядзеньне да канца 2005 году парлямэнцкіх выбараў у Беларусі.

Вядома, праціўнікі кампрамісу ў Маскве выступяць супраць такога варыянту разьвіцьця падзеяў. Аднак у Пуціна дастаткова ўлады і аўтарытэту, каб нэўтралізаваць унутраных крытыкаў. І калі Пуцін і яго калегі на Захадзе маюць адвагу і мудрасьць, каб зрабіць такі сьмелы крок у наступным месяцы, дык далейшага пагаршэньня расейска-заходніх адносінаў удалося б пазьбегнуць. Пуцін, вядома, павінен гарантаваць дэмакратыю і ў сваёй краіне, але вырашэньне беларускага пытаньня магло б захвоціць эўрапейцаў і амэрыканцаў да новых інвэстыцыяў у Расеі. Калі гэтага не адбудзецца, – заканчвае свой артыкул у "Moscow Times" літоўскі журналіст Рычард Крыкас, – дык 9 траўня посьпех Пуціна выглядае праблематычным.

Гэта быў кароткі зьмест артыкулу міжнароднага аглядальніка літоўскай газэты "Lietuvos Rytas" у расейскім тыднёвіку "Moscow Times".

Перамога акадэмікаў: іх будуць абіраць паранейшаму таемным галасаваньнем

Агульны сход Нацыянальнай Акадэміі навук не зацьвердзіў у новым статуце большасьці палажэньняў, супраць якіх выступіла група акадэмікаў. Навукоўцы называюць гэта актам непадпарадкаваньня і прыкладам у справе змаганьня за акадэмічныя правы і свабоды, а таксама за агульначалавечыя каштоўнасьці.

Прапанова, якая выклікала найбольшы пратэст навукоўцаў, — пра адкрытае галасаваньне пры абраньні акадэмікаў і членкарэспандэнтаў на агульным сходзе — была адхіленая. Вось як вынік сходу пракамэнтаваў колішні кіраўнік Нацыянальнай Акадэміі навук Аляксандар Вайтовіч:

(Вайтовіч:) "Вынік сходу задавальняе: супраць чаго мы былі — нічога ж не прайшло. Гэта першае, а другое — мне вельмі шкада, што шмат часу акадэмія марнуе. Ну, каму патрэбныя былі гэтыя зьмены? Шмат, вельмі шмат больш важных пытаньняў ёсьць, а мы марнуем свой час і нэрвы на гэта".

Аляксандар Вайтовіч быў адным зь сямідзесяці акадэмікаў і член-карэспандэнтаў, якія падпісалі ліст пратэсту на адрас Аляксандра Лукашэнкі.

У сваім звароце навукоўцы выказвалі нязгоду з прапанаваным плянам зьменаў у статут акадэміі. А такія прапановы, як права пазбаўляць акадэмікаў навуковых званьняў, забараняць ім займацца палітыкай і грамадзкай дзейнасьцю не ўвайшлі нават у праект прапановаў.

Акадэмік Іван Нікітчанка назваў гэта перамогай акадэмічнай супольнасьці ў справе змаганьня з адміністрацыйным ціскам.

(Нікітчанка:) "Акадэміяй камандаваць, як хочуць, яны ня будуць. І прызначаць Лукашэнка нам нікога ня будзе. Гэта прыклад. Людзям усім так трэба паступаць, каб па сумленьні, а не па загадзе".

ЭЛИТА ГОТОВА ГОЛОСОВАТЬ ЗА АЛЬТЕРНАТИВНЫХ КАНДИДАТОВ

Но пока не верит в их победу на президентских выборах

В ходе недавнего национального опроса мы выяснили, что среди всех избирателей позиции действующего главы государства применительно к будущим президентским выборам остаются достаточно прочными. Напомним, что почти 46.4 % опрошенных заявили о готовности поддержать его на новых выборах, если голосование будет проводиться завтра; он со значительным отрывом опережает любого оппозиционного кандидата в гипотетической ситуации второго тура; у него самый низкий отрицательный рейтинг, а также более 70% респондентов уверены, что именно он выиграет следующие выборы. При этом отношение рядовых белорусов к оппонентам А. Лукашенко было весьма сдержанным. В отличие от всех избирателей, среди элиты наблюдается иная картина (табл. 1).

Таблица 1. Распределение ответов на вопрос "За кого из потенциальных кандидатов в президенты Беларуси Вы бы проголосовали, а за кого определенно не стали бы голосовать?", %*

Вариант ответа	Все опрошенные			Работники госсектора			Работники негосектора		
	За	**Против**	**ЗО/НО**	**За**	**Против**	**ЗО/НО**	**За**	**Против**	**ЗО/НО**
В. Парфенович	53	15	32	63	13	24	43	17	40
А. Козулин	50	13	37	67	7	26	33	20	47
А. Войтович	45	20	35	47	13	40	43	27	30
В. Колос	43	15	42	50	7	43	37	23	40
А. Лебедько	37	20	43	23	23	54	50	17	33
А. Милинкевич	28	18	54	17	17	66	40	20	40
Н. Машерова	27	32	41	30	23	47	23	40	37
В. Леонов	22	27	51	20	23	57	23	30	47
В. Фролов	18	28	54	7	30	63	30	27	43
С. Калякин	17	45	38	10	47	43	23	43	34
П. Кравченко	17	40	43	23	30	47	10	50	40
А. Ярошук	15	22	63	10	17	73	20	27	53
А. Климов	13	42	45	10	40	50	17	43	40
З. Позняк	13	55	32	10	63	27	17	47	36
Н. Статкевич	5	38	57	7	27	66	3	50	47
С. Гайдукевич	2	80	18	3	73	24	–	87	13
А. Лукашенко	2	88	10	3	87	10	–	90	10

** Эта таблица читается по горизонтали.*

Во-первых, у представителей элиты А. Лукашенко получил самый высокий отрицательный рейтинг, а также самый низкий положительный. Во-вторых, лидеры и эксперты смогли ясно обозначить своих фаворитов – В. Парфеновича и А. Козулина. В-третьих, эти фавориты, а также следующие за ними А. Войтович и В. Колос, не принадлежат к так называемой традиционной или партийной оппозиции. Ее лидеры, А. Лебедько, С. Калякин, Н. Статкевич уступили первой "четверке", прежде всего, за счет невысоких показателей среди работников госсектора, на первое место поставивших А. Козулина (он получил и самый низкий отрицательный рейтинг).

Бывший ректор БГУ уверенно лидирует и в списке тех, кто, по мнению элиты, может успешно конкурировать с А. Лукашенко на следующих президентских выборах (табл. 2).

Таблица 2. Распределение ответов на вопрос "А кто из этих политиков, по Вашему мнению, сможет успешно конкурировать с А. Лукашенко на следующих президентских выборах?", % *(открытый вопрос, возможно более одного ответа)*

Вариант ответа	Все опрошенные	Работники госсектора	Работники негосектора
А. Козулин	37	33	40
В. Парфенович	22	27	17
Н. Машерова	17	13	20
А. Войтович	12	7	17
А. Лебедько	10	–	20
В. Леонов	10	7	13
А. Милинкевич	8	–	17
С. Калякин	5	–	10
А. Климов	5	3	7
В. Фролов	5	–	10
В. Колос	2	3	–
М. Маринич	2	3	–
З. Позняк	2	–	3
А. Ярошук	2	–	3
Никто	27	43	10

Причем, наиболее высоко оценили его шансы как раз представители негосударственного сектора, которые сами за него не очень-то настроены голосовать, но, несмотря на это, признают его потенциал. Таким образом, что предположения о том, что А. Козулин имеет прочные позиции среди элиты, действительно, нечто большее, чем просто предположения. Однако шансы на победу на выборах всех без исключения конкурентов действующего президента элита, как, впрочем, и все избиратели, оценила невысоко (табл. 3).

РОО "НИСЭПИ"

● *Іхнія норавы*

У ШВЭЦЫІ ЎЛАДА ДЛЯ ЛЮДЗЕЙ, А НЕ НААДВАРОТ

Па плошчы Швэцыя ледзьве не ў два разы большая за Беларусь, а вось насельніцтва больш ў нашай краіне, гэтак амаль тысяч на дзевяцьсот. Так што па гэтых параметрах краіны цалкам супастаўляльныя, а вось у астатнім...

Канстытуцыя Швэцыі вызначае дзьве сфэры публічнай улады: дзяржава і мясцовая ўлада. Дзяржава акрамя ўраду прэзентуецца яшчэ праз абласныя саветы (21), 95% якіх скіроўваецца на ахову здароўя мясцовага насельніцтва. Гэта іхняя асноўная функцыя.

На мясцовым жа ўзроўні дзяржава не мае прадстаўніцтва—там дзейнічаюць струкруры мясцовага самакіраваньня. Мясцовыя муніцыпалітэты(па ўсёй краіне іх 290) падпараткоўваюцца толькі закону і мясцовым жыхарам.

Як вы бачыце ў нашых суседзяў адсутнічае ўладная іерархія—усе муніцыпалітэты роўныя, яны непасрэдна і кіруюць тэрыторыямі, сыходзячы са сродкаў бюджэту, 20% якога ідзе на клопат пра састарэлых, 19% на пачатковую школу, 12 % на дашкольнае навучаньне, 9% на паслугі асобінам з парушэньнямі апорна- рухальнай сістэмы, 7% на сярэднюю школу, 6% на грамадскія паслугі (каналізацыя, водазабесьпячэньне...), 5% на вячэрняе навучаньне і гэтак далей.

Бюджэт фармуецца за кошт падаходнага падатку з жыхароў, якія пражываюць на пэўнай тэрыторыі— 65%, з субсыдый нацыянальнага ўраду—15%, з другіх крыніцаў—11%, са збораў і плацяжоў—9%.

У нацыянальным парламеньце—прадстаўнікі 7 палітычных партый, у муніцыпальных органах кіраваньня – чальцы 200 партый.

Кожныя чатыры гады ў трэцюю нядзелю верасьня адначасова адбываюцца выбары ва ўсе прадстаўнічыя органы ўлады. Галасаваньне ідзе па партыйных сьпісах (партыям трэба набраць 5 -8%).

Назіраць за працэсам галасаваньня мае права кожны выбарнік краіны. Для гэтага не патрабуецца аніякай рэгістрацыі. Па ягоным патрабаваньні чальцы камісій мусяць даць любую інфармацыю па працэсу галасаваньня. 30-40 % швэдаў галасуе па пошце. Выбары адбываюцца ў адзін дзень. Самае вялікае парушэньне на выбарах, якое прыгадаў Ян Хульт, першы сакратар Стакгольмскага гарадскога Савету,— гэта непадлік 10 галасоў выбарнікаў на адным з участкаў з-за таго, што выбарчыя бюлетэні, адасланыя па пошце, своечасова не трапілі на месца. Прыйшлося рабіць паўторныя выбары, хоць вынікі галасаваньня так і не зьмяніліся.

Пачытаеш такую інфармацыю і няёмка зробіцца за нас з вамі. Улада навыдумляла для сябе недэмакратычных законаў і законна маніць свой маўклівы беларускі народ, а яму— абы ціха...

Назіральнік.

● *Ліст у рэдакцыю*

ДАІЛІ, ДОЯЦЬ І ДАІЦЬ БУДУЦЬ

Днямі прыйшоў на адрас рэдакцыі ліст. Жанчына дзелецца сваёй праблемай, якую не ў стане ніхто вырашыць. Дзяржава адабрала ў грамадзянкі каля 700 тыс.рублёў і,ніколькі не саромячыся, вуснамі сваёй чыноўніцы яшчэ заявіла, што магла б адабраць і болей. А зараз усё па парадку.

У мінулым годзе жанчына атрымала ад свайго сына , які працуе за мяжой каля 2000 даляраў. Завінавачаныя грошы трэба было вярнуць у якасьці віны знаёмаму, які даў іх пад працэнты на білеты і на саму паездку ў далёкую краіну.

І вось тут узьнікае некалькі праблемаў. Першая ў тым, што грошы высылаў не сам сын, а ягоны працадаўца, і маці ў якасьці падаткаў трэба было заплаціць у падатковую інсьпекцыю блізу 400 тыс. рублёў.

Другая, у тым, што жанчына, якая мае толькі адну крыніцу фінансаваньня— сваё месца працы, ніколі не падавала, а таму і забыла своечасова падаць у падатковыя органы дэкларацыю пра савакупны гадавы даход. За што і была аштрафавана на дзве мінімальныя зарплаты.

Трэцяя праблема ў тым, што з усяе савакупныя сумы прыйшлося яшчэ заплаціць падатак у памеры 250 тысяч рублёў.

Атрымалася так, што заплаціўшы ў якасьці штрафу і падатку 300 тыс рублёў грамадзянка вымушана была выкласьці з уласнае кішэні амаль сваю месяцовую зарплату за грошы, якія ёй не прызначаліся.

Недасканаласьць існуючых законаў відавочная ў розных галінах жыцьцядзейнасьці. Часам узнікае думка, што дзяржава наўмысна за кошт сваіх жа грамадзянаў, прычым не самых багатых, імкнецца вырашыць свае задачы.

Калі б была магчымасьць мець інфармацыю пра сабраныя неправедным шляхам сродкі (праз надуманыя шрафы і недасканалыя законы) даныя былі б ашаламляльныя.

Янка Жыхар.

● *Крымінал*

ЧАМУ РАСЬЦЕ ЗЛАЧЫННАСЬЦЬ?

Як сьцьвярджае пракурор Віцебскага раёну Валянцін Шаеў, рост злачыннасьці ў раёне за мінулы год у параўнаньні з 2003 годам склаў 2, 5 %, хаця па вобласьці злачыннасьць скарацілася на 0, 6 %.

У маладзёвым асяроддзі злачыннасьць падвысілася ледзьве не ўдвая (на 97,1%). Па вобласьці ж зьменьшылася на 0, 5 %. 25 падлеткаў зрабілі злачынствы паўторна. 15 непаўнагадовых злачынцаў займаліся супрацьпраўнымі дзеяньнямі ў стане алкагольнага ап'яненьня.

Шакуе* тое, што людзі не ўсьведамляюць каштоўнасьці чалавечага жыцьця і недатыкальнасьці чалавечай асобы. З 11 памкненьняў да забойства, 10 скончыліся згубаю*, " ...крымiналізацыя бытавых адносінаў носіць устойлівы характар".

Працаўнікі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў нанесьлі шкоду на суму звыш 40 млн.рублёў, заведзена 57 крымінальных справаў. Крадзёж быдла, атрутных рэчываў, паліўна-змаскавых матэрыялаў, гароднiны, зерня носіць ледзьве не масавы характар. Нягледзячы на шматлікія праверкі пракуратуры колькасьць парушэньняў і злачынстваў* не зьмяньшаецца.

Пракуратура робіць цэлы шэраг высноваў: "неабходны больш наступальны падыход да ліквідацыі прычынаў і ўмоваў, што спрыяюць крадзяжам", трэба адмовіцца ад фармалізму ў працы з насельніцтвам і падлеткамі, падвысіць ролю папераджальных мераў, шырэй выкарыстоўваць артыкулы крымінальнага кодэксу, якія прызначаны для зьмяньшэньня колькасьці больш цяжкіх злачынстваў("здзек і пагроза забойствам", " абмежаваньне дзеяздольнасьці асобін, што злоўжываюць сьпіртовымі напоямі"...).

Высновы, зробленыя пракурорам, мелі б досыць грунтоўны выгляд, каб не тая акалічнасьць, што нягледзячы на самаахвярныя намаганьні сьледчых і кантрольных органаў, школы і іншых установаў у бліжэйшай перспектыве злачыннасьць мусіць толькі павялічвацца. З-за таго, што ўся праваахоўная сістэма і да сёньня не пазбавілася старых савецкіх падыходаў(цяганіны* і залішняй бюракратызацы), адмыслоўцы* разам з пэршачарговай вымушаны займацца малавыніковай, а часам і безвыніковай працай, марнуючы час і сродкі.

Найгалоўнейшымі прычынамі жахлівага росту злачыннасьці з'яўляюцца пагалоўная алкагалізацыя дзяржавай насельніцтва, яго нізкі матэрыяльны стан, адсутнасьць аб'ектыўнай інфармацыі пра злачыннасьць, адсутнасьць прафесіяналаў высокага ўзроўню, нежаданьне дзяржавы ісьці на нефармальны дыялог з грамадскасьцю , цьмянасьць персьпектываў на будучыню для пераважнай колькасьці людзей, нерасрацаванасьць праблемаў дзяржаўнага будаўніцтва і заканадаўства, зачаткавы стан грамадзянскай супольнасьці, адсутнасьць нацыянальнай школы, сьвядомая русіфікацыя, дыскрэдытацыя дзяржавай нацыянальнай культуры і яе найвядомейшых прадстаўнікоў, абмежаванасьць свабоды і дэмакратыі...

Стаўшы закладніцай палітычнай сістэмы, якая пачала будавацца з 1994 году, грамадства пакуль няздольнае прызнацца сабе і ў сваёй адказнасьці за ненатуральную крымiналізацыю ўсіх сьфераў жыцьця.

Пры тых посьпехах у эканоміцы , пра якія распавядаюць нам сродкі масавай інфармацыі, даўно мусіла б наступіць аптымізацыя грамадскай сьвядомасьці, безь якой марна спадзявацца на бараць-бу са злачыннасьцю.

Мана ніколі не стане рэальнасьцю, як не пераконвай сябе і іншых у яе сапраўднасьці.

Янка Жыхар.

«ПОКЛІЧ ВОЛІ»
КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, вышліце па адрасу: г.Віцебск, 3-я Мопраўская, д. 14 , і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш 15 слоў) бясплатна.

Тэкст__________________________

Адрас, тэлефон____________________

Заснавальнік і рэдактар: Сяржук Салодкі.
Адрас рэдакцыі: г. Віцебск,
3-я Мопраўская, д. 14, тэл. 26-42-02

Выдадзена пры падтрымцы Віцебскага аддзялення ГА "Фонд імя Льва Сапегі".
Распаўсюджваецца бясплатна. Наклад 290 асобнікаў.